прадугледжваюць неабходнасць аднаўлення, запатрабавання культурна-гістарычнай спадчыны, каштоўнасцей, як мага хутчэйшага ўключэння іх у сучасныя культурныя працэсы. Вялікай дапамогай у гэтай справе павінен стаць адзін з апошніх законаў Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», які вызначае ўмовы духоўнага, інтэлектуальнага і эканамічнага развіцця грамадства з мэтай захавання, належнага ўтрымання, рацыяналь-нага выкарыстання, аднаўлення і памнажэння гісторыка-культурнай спадчыны. Менавіта ў Законе ўпершыню вызначаецца паняцце гісторыка-культурнай спадчыны як сукупнасці адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях, даецца новая класіфікацыя каштоўнасцей. Можа некаторыя даследчыкі і знойдуць гэты Закон не зусім дасканалым. На наш погляд, асноўныя яго палажэнні могуць, з аднаго боку, стаць зместам некаторых напрамкаў сацыякультурнай дзейнасці менавіта таму, што культурна-гістарычная спадчына, каштоўнасці, апрабаваныя гістарычным вопытам шматлікіх пакаленняў, адпавядаюць высокім запатрабаванням гуманізму. З другога боку, у якасці сацыякультурных стабілізатараў магчыма разглядаць усё тое, што нясе ў сабе асаблівасці насельніцтва рэгіёна, звычаяў, традыцый, свят і абрадаў. Як мы бачым, пытанні культурна-гістарычнай спадчыны знаходзяцца якраз на стыку шматлікіх навук, дзе, як вядома, могуць з'яўляцца самыя цікавыя нечаканасці і адкрыцці. Асобныя раздзелы гісторыі і тэорыі беларускай культуры распрацоўваліся інстытутамі гісторыі, філасофіі, мастацтвазнаўства, мовазнаўства, літаратуры Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь і шматлікімі даследчыкамі. Мы лічым, што неабходна комплексна падысці да вывучэння і выкладання не толькі культурна-гістарычнай спадчыны, але і іншых курсаў сацыякультурнай дзейнасці, якія ажыццяўляюцца кафедрай мэнеджмэнту сацыякультурнай сферы Беларускага універсітэта культуры. Менавіта ад таго, як будуць выхаваны і падрыхтаваны выпускнікі універсітэта, залежыць і вырашэнне пакуль што праблематычнага пытання -- быць беларусам на свеце ці не быць. Не без падстаў мы нагадваем словы нашай славутай і пакутнай суайчынніцы Ларысы Генію:

На роднай зямельцы
Ўсе мы не госці,
Усе мы чыесьці, усе мы кагосьці.
Хоць спарахнелі дзядоў нашых косці,
У нашай натуры ёсць іхняе штосьці.

Макарава А.А.,
ст. выкладчык
Сівурава Л.П.,
супрацоўнік Беларускага
інстытута праблем культуры

# САЦЫЯЛЬНАЯ РОЛЯ ДЗЯРЖАЎНЫХ УСТАНОЎ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ВОЛЬНАГА ЧАСУ І ПРАБЛЕМЫ МЕТАДЫЧНАГА КІРАЎНІЦТВА ІХ ДЗЕЙНАСЦЮ Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

Менавіта з нагоды надзённасці гэтых праблем і неабходнасці іх вырашэння быў створаны Рэспубліканскі савет дырэктараў навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці і культурных цэнтраў па арганізацыі вольнага часу, які на працягу года дзейнічае пры Беларускім інстытуце праблем культуры. Чарговае яго пасяджэнне, што адбылося нядаўна на Магілёўшчыне, як і папярэднія сустрэчы вядучых спецыялістаў навукова-метадычных служб рэспублікі, яшчэ раз пацвердзілі патрэбу ў пераасэнсаванні сацыяльнай ролі дзяржаўных клубных установаў у прынцыпова новым разуменні сутнасці культурнай работы па арганізацыі вольнага часу.

Зразумела, што без адпаведнага навуковага погляду на сучасныя праблемы гэтай сферы зараз немагчыма вызначыць усе шляхі і накірункі развіцця дзяржаўных клубных устаноў. Але ўжо сёння відавочна, што клубныя ўстановы розных тыпаў з'яўляюцца перш-наперш цэнтрамі арганізацыі самадзейнай творчасці і культурнага адпачынку грамадзян рэспублікі. Нельга не пагадзіцца з думкаю, што каштоўны сацыяльны здабытак, якім для грамадства з'яўляецца вольны час, пры нізкай культуры яго арганізацыі і ненапоўненасці шматлікімі відамі і формамі заняткаў, ператвараецца ў вялікую сацыяльную небяспеку.

Сучасная практыка, на думку вядучых спецыялістаў-членаў Рэспубліканскага савета, патрабуе сёння ад навукоўцаў абгрунтаваных праектаў развіцця культурнай сферы з улікам рэгіянальна-нацыянальных і культурна-гістарычных асаблівасцей. Гэтая ж практыка дыктуе неабходнасць навукова-метадычных распрацовак па стварэнню розных тыпаў устаноў культуры і мадэляў іх дзейнасці з улікам разнастайнасці інтарэсаў усіх груп насельніцтва.

Даволі востра паўстае таксама праблема навукова-метадычнага кіраўніцтва дзейнасцю устаноў культуры па арганізацыі вольнага часу. Дарэчы, у сучасны момант у рэспубліцы дзейнічае 4687 розных устаноў клубнага тыпу. Зразумела, што ўдасканальванне агульнага прафесійнага майстэрства арганізатараў сама-дзейнай творчасці, культурна-забаўляльных праграм і адпачынку ў значнай меры залежыць ад інфармацыйна-метадычнага забеспячэння культурнай сферы ўвогуле. Менавіта навукова-метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтрам культуры па



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізацыі вольнага часу належыць выконваць задачы абагульнення вопыту, яго сістэматызацыі і аналізу з пункту гледжання адпаведнасці яго патрабаванням часу, навізны, арыгінальнасці і выхаваўчай актыўнасці.

Адным з найбольш актуальных пытанняў застаецца падрыхтоўка навукова-метадычных супрацоўнікаў. Недахоп, а часцей адсутнасць спецыялістаў з адпаведнай кваліфікацыяй, падрыхтаваных да тэарэтычна-аналітычнай і інфармацыйна-метадычнай дзейнасці, здольных збіраць, сістэматызаваць, апрацоўваць і распаўсюджваць прафесійную інфармацыю, адбіваецца сёння на якасці культурных праграм, на дзейнасці устаноў культуры.

Трэба падкрэсліць, што дзякуючы рабоце абласных навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці і цэнтраў культуры па арганізацыі вольнага часу сёння адбываюцца разнастойныя сацыяльна-культурныя мерапрыемствы, праводзяцца шматлікія фестывалі, конкурсы, святы. Па ініцыятыве супрацоўнікаў гэтых цэнтраў ажыццяўляецца адраджэнне народных традыцый і звычаяў. Захаваць навукова-метадычныя цэнтры – значыць забяспечыць пераемнасць і паслядоўнасць у развіцці народнай творчасці і дзейнасці устаноў культуры па арганізацыі вольнага часу.

Асобая ўвага членаў савета была скіравана на пытанні ажыццяўлення рэспубліканскай праграмы «Спадчына». Так гістарычна склалася, што зварот да вытокаў нацыянальнай культуры і адраджэнне яе -- справа амаль што новая і надзвычайна складаная. Як адрадзіць і ўкараніць у сучасны сацыяльна-культурны працэс традыцыі і звычаі, якія спакон веку былі на Беларусі? Як захаваць і забяспечыць існаванне тых здабыткаў нацыянальнай культуры, якія складаюць нацыянальна-этнічныя асаблівасці беларускага народа? Спецыялістаў з навукова-метадычнай падрыхтоўкай дзеля ажыццяўлення пастаўленай дзяржаўнай задачы таксама вельмі мала. Многія практычныя работнікі на сённяшні дзень не да канца разумеюць мэты і задачы дзейнасці устаноў культуры па арганізацыі вольнага часу. Між тым з іх боку адчуваецца зацікаўленасць у павышэнні прафесійнага майстэрства і самаўдасканаленні, што было відавочна пры знаёмстве з вопытам работы ўстаноў культуры рэспублікі.

Вырашэнню вышэйазначаных праблем, на агульную думку ўдзельнікаў савета, можа ў значнай меры садзейнічаць стварэнне прафесійнага перыядычнага часопіса па праблемах народнай творчасці і дзейнасці па арганізацыі вольнага часу.

Грыгаровіч Я.Д.,
дацэнт

## АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ САЦЫЯЛЬНАГА ПЕДАГОГА

З пераходам грамадства да рынкавых адносін і з'яўлення сацыяльна абяздоленых у матэрыяльным і духоўным сэнсе людзей узнікае настойлівая патрэба ў стварэнні механізмаў і інстытутаў іх абароны, умоў для нармальнага, гарманічнага існавання ў асяроддзі сабе падобных. Гэтым ва ўсім свеце займаюцца службы сацыяльнай дапамогі насельніцтву, аб'ядноўваемыя адным тэрмінам -- сацыяльная работа (ці сацыяльнае выхаванне).

Слова «сацыяльны» паходзіць ад лацінскага «socialis» - абшчынны, супольны, агульны. Па сэнсу да яго блізкія беларускія словы: суполка, талака, зямляцтва, словы, якія абазначаюць назвы канфесійных, нацыянальных, рэгіянальных аб'яднанняў людзей для сумеснай жыццядзейнасці (працы, адпачынку, духоўнай еднасці і інш.). Маючы мноства напрамкаў дзейнасці (медыцынская, юрыдычная, фізкультурна-аздараўленчая, экалагічная, ці, як яе называюць у свеце, валеалагічная, сацыякультурная, ці анімацыйная, віктымалагічная і інш.), сацыяльная педагогіка аб'яўляе сваім галоўным канцэптуальным палажэннем прымат асобы. А галоўны прынцып яе -- нацыянальна-рэгіянальны: стварэнне сістэмы службаў сацыяльнай дапамогі насельніцтву ў соцыуме, зместам дзейнасці якіх з'яўляюцца самакіраванне, самаарганізацыя з мэтамі задавальнення патрэб і схільнасцей чалавека ў межах абшчыны, суполкі, зямляцтва, канфесіі, сям'і на аснове традыцыйнай культуры і нацыянальных асаблівасцей індывідаў.

Гэтай працай займаецца сацыяльны педагог -- чалавек, арыентаваны на працу з усімі катэгорыямі дзяцей і дарослых, з сем'ямі і рознымі аб'яднаннямі людзей. Зыходзячы з ідэі прымату асобы, ён імкнецца экстрапаліраваць патрэбы і інтарэсы асобнага чалавека ў патрэбы суполкі, групы, з якой працуе. Асноўная сфера дзейнасці сацыяльнага педагога -- «асоба ў асяродку», «асоба ў сітуацыі», «асоба ў сям'і», г.зн. вывучэнне, дыягностыка і карэляцыя індывіда без адрыву ад звычайнага традыцыйнага асяродка. Галоўнае пры гэтым не «зрабіць за яго», забаўляць, весяліць пасіўную асобу, пазіраючую за дзейнасцю сацыяльнага педагога, ці навязваць ёй свае меркаванні, а дапамагчы чалавеку знайсці сябе, развіць свае здольнасці, арганізаваць дзейнасць для душы і па душы, дапамагчы захаваць свой гонар, нягледзячы ні на якія цяжкасці і змену няўстойлівых палітычных амбіцый улад.

У функцыі сацыяльнага педагога ўваходзяць таксама і арганізацыя той ці іншай дзейнасці асобы, адаптацыі да яе, дапамога ва ўзаемаадносінах з медыцынскімі, адукацыйнымі, культурнымі, спартыўнымі, прававымі ўстановамі, грамадскімі і іншымі

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ



БІБЛІЯТЭКА
Беларускага універсітэта культуры
№ 299558